фокусируется внимание людей, отношение общества в целом и его отдельных групп к политике властей (политическим кампаниям, внешнеполитическим акциям, способам решения продовольственной, жилищной и других проблем).

Изучение условий жизни простых людей, их быта, нравов, традиций не может быть полным, а значит, не достаточно объективным без обращения к материалам устной истории, тогда как из жизни уходит поколение людей, очевидцев событий исследуемого периода. Привлечение информации, почерпнутой из рассказов очевидцев, позволяет увидеть историю послеоккупационного военного периода глазами обыкновенных людей, отражает специфику их потребностей и мотивы поведения. Рассмотрение общегосударственных процессов сквозь призму повседневной жизни конкретного региона позволяет показать разнообразие общеисторического процесса, обогатить белорусскую военную историю новыми конкретными фактами и событиями. Так как запись воспоминаний проводится спустя 70 лет после произошедших событий, в них, как правило, отсутствуют детали и подробности, однако, благодаря этим устным источникам, есть возможность ознакомиться с наиболее устойчивыми, не исчезнувшими в течение длительного времени впечатлениями людей-современников тех событий. Полученные материалы сочетают в себе индивидуализированную информацию с опытом, разделенным многими. Анализ воспоминаний не претендует на всеохватность и полноту описания, но позволяет в определённой мере отразить субъективное восприятие послеоккупационной повседневности.

Таким образом, имеющиеся архивные источники характеризуются информационной насыщенностью, критическое их осмысление, сопоставление и сравнительный анализ с материалами устной истории представляют возможность создать достаточно полную картину повседневной действительности Витебщины после освобождения ее территории и до окончания Великой Отечественной войны, а также позволяют изучить особенности положения населения в переломный период перехода от состояния войны к мирной жизни, характерные для республики в целом.

**Давідоўская В.М.**

## ВІЦЕБСК У 1945 ГОДЗЕ: АГЛЯД ФОТАДАКУМЕНТАЎ СА ЗБОРУ ВІЦЕБСКАГА АБЛАСНОГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

Жыццё пасляваеннага Віцебска знайшло адлюстраванне ў шматлікіх працах даследчыкаў, аб'ектам увагі якіх сталі праблемы аднаўлення разбуранай падчас Вялікай Айчыннай вайны гаспадаркі – прамысловасці, жыллёвага фонду, транспарту і камунікацый, сельскай гаспадаркі, а таксама становішча адукацыі, культуры, медыцыны, паўсядзённае жыццё людзей. Пры гэтым прыярытэтнымі для навукоўцаў, краязнаўцаў, як правіла, з'яўляліся пісьмовыя крыніцы. Між тым немалаважнае значэнне ў даследаванні пасляваеннай рэчаіснасці маюць візуальныя крыніцы, у прыватнасці, фотадакументы. Яны не толькі дапаўняюць пісьмовую інфармацыю, але здольны выступаць самастойнымі крыніцамі, якія фіксуюць і перадаюць гістарычныя факты і падзеі зрокавым вобразам і ўздзейнічаюць эмацыянальна.

У дадзеным даследаванні галоўнай мэтай з'яўляецца атрыбуцыя і інтэрпрэтацыя фотадакументаў, якія адлюстроўваюць становішча пасляваеннага Віцебска ў 1945 г. У зборы Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (далей ВАКМ) такіх прадметаў выяўлена 298 адзінак – 280 фатаграфіі і 18 негатываў. Адзначым, што ў іх ліку маюцца «хрэстаматыйныя» здымкі, якія выкарыстоўваліся як ілюстрацыйны матэрыял у навуковых і навукова-папулярных працах, апублікаваны ў многіх выданнях, але большасць фатаграфій уводзіцца ў навуковы зварот упершыню.

Здымкі паступалі ў музейны збор на працягу 1945–1946 гг. ад розных арганізацый: аддзела камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта, арцелі «Гігіена», Віцебскага абласнога ваенкамата, Віцебскага абласнога ўпраўлення НКУС, а таксама са збору беларускага мастацтвазнаўцы М. Кацара.

Большасць фотадакументаў (138 фотаздымкаў і 18 негатываў) была перададзена ў музей **з арцелі «Гігіена»**. Гэта вытворчае аб'яднанне працавала ў г. Віцебску яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны як цырульня. Пасля вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў аднавіла дзейнасць 27 чэрвеня 1944 г. у складзе двух падраздзяленняў – цырульні і фотастудыі. Падпарадкоўвалася Віцебскаму абласному шматпрамысловаму саюзу, размяшчалася па адрасе: вул. Ленінская, 19 (будынак не захаваўся). У фотастудыі арцелі «Гігіена» выконваліся



Репозиторий ВГУ

фотаздымкі для пасведчанняў, фотаздымкі-візіткі, фотаздымкі-паштоўкі [3]. Таксама фатографы арцелі выконвалі заказы на выраб фотаздымкаў па дамоўленасці з рознымі арганізацыямі і ўстановамі Віцебска. У прыватнасці, у Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці (далей ДАВВ) захаваўся дагавор, складзены 7 сакавіка 1945 г. паміж Беларускім дзяржаўным музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і арцеллю «Гігіена», на выкананне фотаработ у горадзе Віцебску «по тематике и указанию администрации музея по прилагаемому списку» (спіс не захаваўся). Адбіткі з негатываў павінны былі быць памерам не больш 13х14 см у колькасці шасці асобнікаў з кожнага негатыва, якія з'яўляліся ўласнасцю музея [3, спр. 3, арк. 15]. Вядома, што па адным асобніку большасці фотаздымкаў, выкананых у арцелі «Гігіена», было перададзена ў Мінск у музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, па адным-два асобніку – у віцебскі музей.

Па дакументах ДАВВ, у 1945 г. у фотастудыі арцелі «Гігіена» працавалі фатограф М. Мірмовіч, член-фатограф Глінкіна і рэтушор Е. Барвінская [3, спр. 2]. Фотаздымкі з выявамі Віцебска па заказе музея выконваў пераважна М.Д. Мірмовіч (яго прозвішча пазначана на некаторых адбітках, а таксама згадваецца ў некалькіх музейных уліковых дакументах). Асабістая справа М. Мірмовіча ў фондзе ДАВВ адсутнічае, і на дадзены момант падрабязных звестак пра фатографа намі не выяўлена.

Паступленні фотаздымкаў з арцелі «Гігіена» адбываліся на працягу 1945 г., спосаб паступлення – закупка. Памеры здымкаў: найменшы 8,1х10,6 см, найбольшы 11,8х16 см. Першыя фатаграфіі былі перададзены ў музей 28 студзеня 1945 г. – 6 фотаздымкаў з выявамі разбуранага чыгуначнага вакзала (выгляд з боку Прывакзальнай плошчы і з боку перона) і разбуранага моста праз р. Заходнюю Дзвіну. Пазней былі перададзены здымкі з выявамі разбураных віцебскіх прадпрыемстваў (малаказавода, панчошна-трыкатажных фабрык імя КІМ і імя К. Цэткін, алейнага і іголкавага завода, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», фабрыкі акуляраў); аб'ектаў камунальнай гаспадаркі (лазні, воданапорных вежаў, рэстарана); будынкаў устаноў і арганізацый (клубаў, дзіцячых дашкольных устаноў, дзіцячага дома, аблвыканкама, пошты, тэатра, бальніц, медыцынскага і педагагічнага інстытутаў); асобных збудаванняў (помніка У. Леніну, мастоў); жылых дамоў. У аб'ектыў фатографа трапілі таксама разбураныя кварталы і вуліцы горада, у тым ліку забудова правага і левага берагоў Зах. Дзвіны, вул. Замкавая, Бібкін завулак (зараз вул. Я. Купалы) і іншыя.

Другая група здымкаў з арцелі «Гігіена» адлюстроўвае ход аднаўленчых работ у Віцебску. На пяці фатаграфіях адлюстравана будаўніцтва моста праз Віцьбу (сучасны Кастрычніцкі мост), якое пачалося яшчэ ў канцы 1944 г. і скончылася ў маі 1945 г. Кіраўніцтва горада лічыла будаўніцтва мастоў у Віцебску «адной з важнейшых задач у справе аднаўлення разбуранай акупантамі гаспадаркі». На гэтую справу мабілізавалася непрацоўнае насельніцтва горада, а таксама супрацоўнікі розных устаноў і арганізацый [2, спр. 18, арк. 6]. Дарэчы, работнікі арцелі «Гігіена» таксама былі задзейнічаны на работах па ўзвядзенні моста праз Віцьбу ў студзені 1945 г. [3, спр. 3, арк. 5].

Некалькі фатаграфій перадаюць знешні выгляд будынкаў, якія адны з першых аднавілі сваю работу пасля вызвалення, – гарадской сталовай, інтэрната педагагічнага інстытута, у якім адбыліся першыя заняткі студэнтаў, будынкаў сярэдняй школы № 10, абкама КП(б)Б (сучасны Мастацкі музей).

Асобна трэба вылучыць здымкі, якія адлюстроўваюць розныя праявы палітыкі фашысцкіх акупацыйных улад у дачыненні да мясцовага насельніцтва. На фатаграфіях – выявы будынкаў, занятых падчас акупацыі нямецкімі або мясцовымі органамі ўлады, у тым ліку фельдкамендатурай (сучасны будынак ветэрынарнага інстытута), гарадской управай (вул. Талстога, 4), службамі СД (вул. Палітэхнічная, 5).

Фатограф арцелі «Гігіена» зрабіў некалькі здымкаў у падвалах былой фашысцкай турмы СД, якая была створана акупантамі ў будынку па вул. Крылова, 7 (зараз тут размяшчаецца Віцебская духоўная семінарыя, у падвалах – музейная экспазіцыя «Памяці патрыётаў Віцебшчыны»). Захавалася 21 фатаграфія (10 выяваў), на якіх чытаюцца надпісы, пакінутыя вязнямі на сценах турэмных камер (арфаграфія захавана – **В.Д.**): «Календарь на февраль 43 / составляли Шулько / расстреляны 12/II 43 г.», «Березкина Лида / 18 лет. – Бомба / 6 сентября / растрел», «Тюрьма, тюрьма, не зарастет к тебе народная тропа / Богданов / Испенков», «Блинов Игорь с Москвы прибыл 9/II–43 г / расстрел 12/II<…>», «Прощай Родина / Пирогов Владимер / приб. 11/II–42 убыл 19/II–42 / Жалко мне жизнь / на вечно», «Рая Шерякова / 1925 г. / Хочу



Репозиторий ВГУ

жить но погибаю / меня расстреля<…>», «Эдуард Гребеньков / растр. 27/II 43 / Кимстач Н.Т. / приб. 2 мая 194<…> партизан». Фотаздымкі сведчаць, што ў ліку вязняў турмы СД былі мірныя жыхары, партызаны, падпольшчыкі. У ліку апошніх – Л. Бярозкіна, З. Васільева, М. Захараў, Э. Грабянькоў, Р. Шаракова.

Чатыры здымкі, выкананыя ў арцелі «Гігіена», змяшчаюць выявы будынка былой люстэркавай фабрыкі, дзе падчас акупацыі размяшчаўся канцэнтрацыйны лагер «Зяркалка» (знаходзіўся ў пачатку сучаснага пр-та Фрунзэ). Гэта быў так званы працоўны лагер, тут утрымлівалася пераважна грамадзянскае насельніцтва – мужчыны, жанчыны, дзеці. Тэрмін утрымання ў лагеры «Зяркалка» быў розны – ад аднаго тыдня да аднаго года, у сярэднім на яго тэрыторыі знаходзілася да 500 чалавек.

Частка здымкаў (21 адзінка, 15 выяваў) была зроблена на тэрыторыі аднаго з буйнейшых у Беларусі канцлагера «5-ы полк», які знаходзіўся на ўскрайку Віцебска (у канцы сённяшняй вул. Цітова). Лагер быў створаны ў хуткім часе пасля акупацыі горада германскімі войскамі і існаваў да мая 1944 г. Ва ўмовах недахопу ежы, цяжкай прымусовай працы, антысанітарыі, здзекавання і катаванняў у лагеры ўтрымліваліся ваеннапалонныя і мірныя жыхары. Людзі паміралі ад захворванняў, голаду, збівання, многія былі расстраляны. Памерлых хавалі тут жа, на тэрыторыі лагера. Праз «5-ы полк» прайшло ўсяго 150 тысяч чалавек, з якіх 80 тысяч загінула [4, с. 11; 1, с. 195].

На фотаздымках зафіксаваны ўнутраны і знешні выгляд баракаў, у якіх утрымліваліся вязні, агульны выгляд тэрыторыі лагера з магіламі да іх раскопвання, раскапаныя магілы з астанкамі памерлых. Ва ўліковай музейнай дакументацыі пазначана, што фатаграфіі з выявамі тэрыторыі канцлагера «5-ы полк» паступілі з арцелі «Гігіена» ў кастрычніку 1945 г. Такая ж дата пазначана на адваротным баку некаторых адбіткаў. Аднак аналізуючы гэтыя здымкі, напрошваецца вывад аб тым, што не ўсе яны былі зроблены ў 1945 г., бо на фатаграфіях – выявы двух розных камісій, якія займаліся даследаваннем месца масавага пахавання савецкіх грамадзян на тэрыторыі лагера «5-ы полк». Першы агляд мясцовасці з раскопваннем магіл быў зроблены ў верасні 1944 г. па даручэнні Абласной камісіі садзейнічання ў рабоце Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі па расследаванні злачынстваў нямецкіх акупантаў, аб чым быў складзены адпаведны акт (захоўваецца ў ДАВВ) [1, с. 193–196]. У акце пазначана, што да яго прыкладаюцца фотаздымкі. На дадзены момант яны адсутнічаюць у архіўным зборы. З вялікай доляй верагоднасці можна сцвярджаць, што здымкі з калекцыі ВАКМ былі зроблены падчас работы вышэйназванай камісіі, а шасцёра яе членаў, якія падпісалі акт абследавання (начальнік УНКУС па Віцебскай вобласці Гогалеў, ваенны пракурор войскаў НКУС Новікаў, аблсудмед-эксперт Сілішчаў, супрацоўнік УНКУС Дамашнеў, начальнік аблсанэпідэмстанцыі Дзем’ячонак, аблдзяржсанінспектар Кардаш), – на фотаздымку КП 8266.

Другі агляд мясцовасці на тэрыторыі лагера «5-ы полк» адбыўся ў кастрычніку (?) 1945 г. пры ўдзеле прадстаўнікоў амерыканскай арганізацыі Чырвонага Крыжа і загадчыцы аддзела аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама М.У. Дзянісавай. Два здымкі з выявай гэтай камісіі, зробленыя фатографам М. Мірмовічам, захоўваюцца ў музеі. Адзін быў перададзены з арцелі «Гігіена», другі – з **Віцебскага абласнога ўпраўлення НКУС БССР.** На адваротным баку аднаго са здымкаў пазначана, што члены камісіі знаходзяцца каля раскапанай магілы, ў якой пахавана каля 8 тыс. чалавек. Падрабязных звестак пра знаходжанне прадстаўнікоў Чырвонага Крыжа ЗША ў Віцебску на сённяшні дзень не знойдзена [4, с. 20], дадзеныя здымкі – адна з не многіх вядомых захаваўшыхся крыніц, якія паведамляюць пра гэту падзею.

Трэба адзначыць, што ў музеі захоўваюцца таксама 18 негатываў на шкле памерам 12,5х18 см, перададзеных з арцелі «Гігіена» і выкананых фатографам Мірмовічам. Чатырнаццаць з іх маюць выявы тэрыторыі канцлагера «5-ы полк», на чатырох негатывах – выявы будынкаў, занятых падчас акупацыі нямецкімі і мясцовымі ўладамі.

Яшчэ адна крыніца паступлення ў музей фатаграфій з выявамі Віцебска ў 1945 г. – **аддзел камунальнай гаспадаркі Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта (гаркамгас)**. Згодна рашэнню выканкама гарадскога савета дэпутатаў працоўных № 440 ад 27.09.1945 г. «аб састаўленні здымкаў разбурэнняў горада Віцебска», у верасні 1945 г. паміж загадчыкам аддзела добраўпарадкавання тав. Агеевым і архітэктарам Андрэем Рыгоравічам Жарковым, жыхаром г. Масква, было складзена працоўнае пагадненне аб выкананні да 1 лістапада 1945 г. 100 адзінак фотаздымкаў, «месцы якіх будуць указаны аддзелам добраўпарадкавання». З кожнага негатыва



Рэпазіторый ВДУ

павінна было быць зроблена 4 здымкі [2, спр. 20, арк. 425, 426]. На сённяшні дзень у калекцыі музея захоўваюцца ўсе 100 здымкаў, выкананых А. Жарковым. Яны былі перададзены ў фонды ў 1946 г., кожны здымак у адным экземпляры. Згодна анатацыям, якія зроблены на адваротным баку здымкаў, іх можна ўмоўна падзяліць на дзве групы – разбурэнні і аднаўленне Віцебска. Большасць фатаграфій адлюстроўваюць стан прадпрыемстваў горада ў 1945 г. – станкабудаўнічых заводаў імя Кірава і імя Камінтэрна, фанернага, чарапічнага, заводаў, спіртзавода, завода заточных станкоў, мясакамбіната, хлебазавода, фабрык імя Кагановіча, імя К. Цэткін, імя КІМ, махоркавай (пераважна, знешні выгляд будынкаў). У ліку выяваў – прадпрыемствы, якія адны з першых пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалі выпускаць прадукцыю: завод заточных станкоў, цагляны завод, фабрыка «Сцяг індустрыялізацыі», хлебазавод, мясакамбінат, спіртзавод. Асобную ўвагу фатограф надаў аднаўленню фанернага завода (10 здымкаў), на базе якога было распачата ўзвядзенне домабудаўнічага камбіната (зараз ААТ «Віцебскдрэў»), а таксама становішчу буйных прадпрыемстваў, якія былі разбураны падчас вайны і хуткімі тэмпамі аднаўляліся, – заводам імя Кірава (8 здымкаў) і імя Камінтэрна (5 здымкаў), цаглянаму заводу (5 здымкаў).

На здымках А. Жаркова значнае месца займаюць выявы асобных збудаванняў, будынкаў, у якіх месціліся розныя ўстановы і арганізацыі Віцебска, – разбураныя вакзал, вадакачка, млын, Кіраўскі мост, стадыён; пашкоджаныя будынкі музея, тэатра, ветэрынарнага і педагагічнага інстытутаў; распачаўшыя работу кінатэатр «Спартак», сярэдняя школа № 10, будынак абкама КП(б)Б. Фатограф зафіксаваў першыя заняткі ў вышэйшых навучальных установах – лекцыю ў ветэрынарным інстытуце, падрыхтоўку да заняткаў у інтэрнаце педагагічнага інстытута.

Выклікаюць цікавасць здымкі, на якіх адлюстраваны часткі, кварталы горада: панарамы правага і левага берагоў р. Зах. Дзвіны; паром, які дзейнічаў да ўвядзення ў эксплуатацыю новага пабудаванага Кіраўскага моста; цэнтральная частка Віцебска – тэрыторыя былых Ніжняга і Верхняга замкаў; адноўлены мост праз р. Віцьбу ў раёне пл. Свабоды і іншыя.

Два здымкі, перададзеныя з гаркамгасу, змяшчаюць выявы вайсковых могілак на Успенскай горцы ў Віцебску, у канцы вул. Савецкай. На адной фатаграфіі бачны помнік героям Айчыннай вайны 1812 года, на другой – былы гарадскі асабняк, сённяшні Арт-цэнтр М. Шагала ў пачатку вул. Путна. Тэматычна гэтыя здымкі можна аб'яднаць з невялікай групай фатаграфій (6 адзінак), **перададзеных** у музей **з Віцебскага абласнога ваеннага камісарыяту** ў чэрвені 1945 г., якія змяшчаюць выявы могілак і асобных магіл загінуўшых удзельнікаў вызвалення г. Віцебска. Яшчэ ў кастрычніку 1944 г. выканкам Віцебскага гарадскога савета дэпутатаў працоўных прыняў рашэнне «прыступіць да ўліку і абсталявання брацкіх і індывідуальных магіл франтавікоў, якія загінулі ў баях за савецкую радзіму на тэрыторыі Віцебска» [2, арк. 122]. А ў красавіку 1945 г. Віцебскім аблвыканкамам было прынята рашэнне «Аб прывядзенні ў належны парадак брацкіх і індывідуальных магіл воінаў Чырвонай Арміі і партызан», згодна якому прадугледжвалася добраўпарадкаванне магіл, будаўніцтва абеліскаў, вызначэнне асоб пахаваных. Аблваенкамат быў абавязаны «здзейсніць фатаграфаванне брацкіх магіл і навакольнай мясцовасці...» [1, с. 361], што і было зроблена. Імя фатографа на дадзены момант не ўстаноўлена. Частка такіх здымкаў сёння знаходзіцца ў Віцебскім аблваенкамаце, частка – у музеі.

На музейных фатаграфіях памерам 12х8,7 см – агульны выгляд вайсковых могілак на Успенскай горцы на фоне былога палаца губернатара і помніка героям Айчыннай вайны 1812 года, а таксама тры асобныя магілы з помнікамі В. Казлову (загінуў 06.04.1945 г.), І. Сівакову (загінуў 20.07.1944 г.), М. Грамачкову (загінуў у верасні 1944 г.). На помніках В. Казлову і М. Грамачкову месцяцца фотапартрэты загінуўшых.

Варта адзначыць здымак, які змяшчае выяву могілак побач з царквой Узвіжання Крыжа (знаходзіліся ў пачатку Смаленскай шашы, зараз Маскоўскага пр-ту). На фатаграфіі бачны пашкоджаны будынак царквы і даваенныя надмагіллі, на першым плане – некалькі абеліскаў на магілах загінуўшых воінаў Чырвонай Арміі, у тым ліку магіла і помнік П.І. Уласаву (1920–1944) з фатаграфіяй на абеліску. Гэты здымак варта аднесці да катэгорыі ўнікальных і асабліва



Репозиторий ВГУ

каштоўных, бо змяшчае адзіную вядомую на сённяшні дзень выяву храма і могілак (абодва аб'екты не захаваліся).

На вышэйпералічаных шасці здымках маюцца сляды ад праколаў кнопкамі. Хутчэй за ўсё, гэтыя прадметы выкарыстоўваліся на музейнай выставе. Вядома, што першая пасляваенная выстава была адкрыта ў ліпені 1945 г. і мела назву «Віцебская вобласць у гады Вялікай Айчыннай вайны». Супрацоўнікі музея мэтанакіравана збіралі матэрыялы, прысвечаныя партызанскаму руху на Віцебшчыне, перыяду акупацыі на тэрыторыі вобласці, а таксама тэме аднаўлення народнай гаспадаркі [5, с. 16, 17]. Сабраныя матэрыялы, у тым ліку фотаздымкі, сталі экспанатамі выставы.

Трэба засяродзіць увагу на становішчы помнікаў архітэктуры Віцебска пасляваеннага часу. Важнае значэнне для вывучэння гэтага пытання маюць здымкі, якія былі зроблены зімой 1945 г. і змяшчаюць выявы культавых збудаванняў. Храмы розных канфесій былі агледжаны спецыяльнай камісіяй па вызначэнню шкоды, нанесенай нямецка-фашысцкімі захопнікамі будынкам-помнікам, якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай і змяшчаюцца ў Віцебску. Пасля агляду кожнага храма быў складзены адпаведны акт, у якім падрабязна апісвалася становішча будынка і кошт страт. Намі выяўлены Акт Камісіі па вызначэнні страт, нанесеных нямецка-фашысцкімі акупантамі архітэктурнаму помніку – царкве Ражства Хрыстова г. Віцебска, складзены 24 лютага 1945 г. (захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь) [6]. Відавочна, да актаў прыкладаліся фотаздымкі з выявамі будынкаў храмаў. Шаснаццаць такіх фотаздымкаў у 1982 г. былі перададзены ў музей мастацтвазнаўцам М.С. Кацарам, які ў 1945 г. з'яўляўся старшынёй упраўлення па справах архітэктуры пры СНК БССР, начальнікам інспекцыі аховы помнікаў архітэктуры і ўзначальваў вышэйназваную Камісію. На фатаграфіях – выявы Багаяўленскай, Дабравешчанскай цэркваў, касцёлаў Св. Варвары і Св. Антонія, цэркваў Ражства Хрыстова, Пятра і Паўла, Мікалаеўскага сабора, сінагогі (усе, акрамя касцёла Св. Варвары, не захаваліся).

Гарадскія ўлады Віцебска таксама разглядалі пытанні аховы помнікаў архітэктуры. У прыватнасці, на пасяджэнні гарсавета 27 кастрычніка 1945 г. разглядалася пытанне становішча Дабравешчанскай царквы («нет кровли, здание занято посторонними жильцами, портящими ценные фрески и захламливающими здание…»), дамініканскага касцёла («превращен в склад горпищетогра, кровля отсутствует, в результате чего гибнет старинная живопись и архитектура…»), Багаяўленскай царквы («превращена в склад декораций драмтеатра, конюшню и баню частных лиц…»), Петрапаўлаўскай царквы («целиком заселена жильцами, нарушающими архитектурные конструкции…»), царквы Св. Духа («не имеет кровли, здание остается полуразрушенным»). Было прынята рашэнне звярнуцца да аблсавета з просьбай аб прыняцці мер па аднаўленню і захаванню помнікаў архітэктуры [2, спр. 21, арк. 165]. Як паказаў час, далёка не ўсё было зроблена для захавання культавых пабудоў Віцебска, і тое, што не было знішчана ў гады Вялікай Айчыннай вайны, было разбурана ў мірны час.

Такім чынам, фотаздымкі з выявамі Віцебска 1945 года змяшчаюць вялікі аб'ём інфармацыі, звязанай з пасляваеннай рэчаіснасцю. Яны адлюстроўваюць становішча прамысловасці, адукацыі, архітэктуры і горадабудаўніцтва, асобныя моманты паўсядзённага жыцця людзей, ушанаванне памяці аб загінуўшых падчас Вялікай Айчыннай вайны. Візуальныя крыніцы дапамагаюць лепш зразумець інфармацыю, атрыманую з іншых крыніц – тэкстаў дакументаў, успамінаў ці расказаў сведкаў. Фотадакументы з выявамі пасляваеннага Віцебска займаюць важнае месца ў агульным комплексе музейных прадметаў, якія раскрываюць тэму Вялікай Айчыннай вайны.

1. Витебщина освобожденная: октябрь 1943 – декабрь 1945: док. и материалы / сост.: Н. В. Воронова [и др.]. – Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. – 584 с.

2. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Ф. 322. Воп. 3. Спр. 5

3. ДАВВ. – Ф. 2298. Воп. 1. Спр. 2, 3.

4. Лагерь смерти «5-й полк» / сост. А. М. Подлипский, В. А. Ризо. – Витебск : Витебская областная типография, 2014. – 80 с.

5. Приказы по Витебскому Государственному историческому музею 1944–1959 гг. – Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. – Ф. 1353.

6. Русская православная церковь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 гг.: сборник документов / сост. О.Ю. Васильева [и др.]. – [Электронны рэсурс]. – Москва, 2009. – 364 с. – Рэжым доступу: http://www.istmira.com/istvtmir/russkaya-pravoslavnaya-cerkov-i-velikaya-otechestv/page/152/. – Дата доступу: 27.04.2015 г.